УДК 908(476)(091)

А. У. Дзянісаў, аспірант

# КРАЯЗНАЎЧЫ РУХ У БССР У 30-Я ГГ. ХХ СТ.

Article addresses the problems of development in the local lore BSSR traffic during 1930 years. While individual sides of the issues were addressed by researchers earlier, this period is the weak level of knowledge. During this period, fundamental changes are taking place in the development of local lore movement. In 1930, the change of leadership the Central Office study of local lore, a regional organization of local history dismantled. Instead, in 1931, established a new system of local lore Movement (Bureau study of local lore and local history departments). Before the task to study regional specialists put the economy province, industrial and agriculture. The project had no success. In 1938, the National History movement was finally eliminated.

**Уводзіны.** Развіццё краязнаўчага руху ў БССР у 30 гг. ХХ ст., тыя змены, якія адбыліся ў яго структуры, сістэме яго арганізацыі і кіравання, асноўных напрамках навукова-даследчай дзейнасці, краязнаўчай методыкі, самой сутнасці савецкага краязнаўства ва ўмовах паскораных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, вылучаюцца дастаткова слабай ступенню даследавання. Тэма краязнаўчага руху ў гэты перыяд разглядалася ў працах Л. Г. Амелькові́ч, Л. В. Аляксеева, у калектыўнай працы «Гістарычнае краязнаўства Беларусі» [1, 2, 3]. Разам з тым дадзены этап развіцця краязнаўчага руху з'яўляецца вельмі важным, бо ў гэты час адбываецца радыкальная перабудова яго структуры ў параўнанні з 20-мі гадамі. Дакументы і матэрыялы, раней малавядомыя, якія былі выкарыстаны пры даследаванні, дазваляюць убачыць працэс развіцця краязнаўчага руху па-новаму.

**Асноўная частка.** У Беларусі ў 1929–1930 гг. пачынаецца згортванне палітыкі беларусізацыі і ўзмацненне аўтарытарных тэндэнцый ва ўсіх сферах грамадскага жыцця. Гэта не магло не закрануць краязнаўчы рух, які вылучаўся дэмакратызмам і грамадскай актыўнасцю, што не дазваляла яму ўціснуцца ў жорсткія рамкі палітычнай сістэмы тых часоў, характэрнай рысай якой з'яўлялася імкненне да поўнага ідэалагічнага і навукова-практычнага кантролю над навукай. Спробы накіраваць краязнаўчы рух да патрабаванняў сітуацыі (калектывізацыя і індустрыялізацыя) прымаліся кіраўніцтвам ЦБК на Трэцяй Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі ў пачатку 1930 г.

Восенню 1930 г. стары склад прэзідыума ЦБК быў адхілены ад справы, акруговыя таварыствы краязнаўства спецыяльнай пастановай ліквідаваны па ўсёй тэрыторыі БССР, арыштаваны найбольш актыўныя дзеячы краязнаўчага руху, у тым ліку намеснік старшыні ЦБК М. І. Каспяровіч, М. Азбукін і інш.

На закрытай частцы паседжання пленума ЦК КП(б)Б 23–24 кастрычніка 1930 г. старшыня Дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення (ДПУ) Р. Я. Рапапорт паведаміў аб раскрыцці ў Беларусі падпольнай контррэвалюцыйнай арганізацыі пад назвай «Саюз вызвалення Беларусі» (СВБ). Спасылаючыся на паказанні арыштаваных раней Я. Ю. Лёсіка, С. М. Некрашэвіча, Д. Ф. Прышчэпава, М. І. Каспяровіча, была абгрунтавана версія аб гісторыі ўтварэння СВБ, яго арганізацыйнай пабудове, стратэгічнай устаноўцы і тактыцы па захопе ўстаноў навукі, адукацыі, асветы і культуры. Асобнае месца ў гэтай сістэме было адведзена і краязнаўчым арганізацыям.

У новы склад прэзідыума ЦБК пры Беларускай акадэміі навук (БАН) увайшлі В. Серафімаў (старшыня), В. Самцэвіч (навуковы сакратар), Ф. Садоўскі (член рэдкалегіі новага краязнаўчага часопіса), Г. С. Аляксандраў (яўрэйскі сектар БАН), В. Сабалеўскі (загадчык школы № 20), Сцепанюк (Народны камісарыят асветы), Г. Кац (ЦСПСБ), П. Зарэмбскі (польскі сектар БАН). Таксама ўвайшлі па аднаму прадстаўнікі ад ЦК КП(б)Б і ЛКСМБ, 3 прадстаўнікі рабочых буйных прадпрыемстваў Мінска па вылучэнні ЦСПСБ [4, арк. 63].

Перад новым складам ЦБК былі вызначаны наступныя мэты: праверка ўсіх краязнаўчых арганізацый, выкрыццё «нацыянал-дэмакратычных элементаў» і перавод краязнаўчай справы ў рэспубліцы да актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве. Часопіс «Наш край» змяніў назву на «Савецкая краіна». Большая частка матэрыялаў часопіса «Савецкая краіна» у 1930–1931 гг. насіла выключна выкрывальніцкі і крытычны характар. Краязнаўцы былі нават абвінавачаны ў працы на карысць польскіх інтэрвентаў. Вывучэнне шляхоў камунікацый, мясцовасці, сацыяльнага складу насельніцтва інкрымініраваліся ім ў якасці шпіянажу. Праверка ЦБК разам з ДПУ краязнаўчых арганізацый на месцах прывялі да арыштаў найбольш актыўных іх удзельнікаў. Былі арыштаваны старшыня Полацкага таварыства С. Мялешка, карэспандэнты ЦБК Р. Пяцэвіч, М. Ламака і інш. [5, с. 88].

Усё гэта прывяло да заняпаду краязнаўчай дзейнасці ўвогуле, што было вымушана прызнаць нават кіраўніцтва ЦБК. Большасць краязнаўчых арганізацый на месцах спынілі сваю дзейнасць, самаліквідаваліся да канца 30-х гг. Такое становішча назіралася ў 1931 г. ў Віцебску, Гомелі, Полацку, Лепелі, Горках, Крупках,

Дрысе і шэрагу іншых месцаў [5, с. 75–77]. Гэтыя абставіны патрабавалі неабходных мераў па пераадоленні крызіснай сітуацыі і наладжванні новай сістэмы, цяпер ужо «сапраўднага савецкага краязнаўства».

Па сваёй сутнасці савецкае краязнаўства 30-х гг., яго тэарэтычныя і практычныя напрамкі кардынальна адрознівалася ад краязнаўства 20-х гг. У 20-х гг. пад краязнаўствам самімі краязнаўцамі разумелася ўсебаковае даследаванне «краю» (гэта паняцце трактавалася як адносна невялікая тэрыторыя, так і ўласна Беларусь) – эканамічнае, гістарычнае, прыродазнаўчае, этнаграфічнае, сацыяльнае і інш. Нягледзячы на тое, што прыярытэтнымі былі вызначаны эканамічныя даследаванні, краязнаўчым арганізацыям на месцах належала права выбару напрамкаў сваёй працы. Як правіла, даследаванні адбываліся ў сферы этнаграфіі, фальклору, гісторыі і прыродазнаўства. У 30-я гг. пад краязнаўствам пачалі разумець выключна даследаванне вытворчых сілаў (аб’ектаў прамысловасці і калектыўнай сельскай гаспадаркі, прыродных багаццяў). Перад краязнаўцамі была пастаўлена задача асвятляць поспехі сацыялістычнага будаўніцтва (індустрыялізацыі і калектывізацыі). Вывучэнне ж краязнаўчымі арганізацыямі гісторыі, фальклору беларускага народа калі і працягвалася, то выключна ў тэме падзей грамадзянскай вайны і рэвалюцыйнага руху. Новаму краязнаўчаму руху намагаліся надаць большую масавасць у параўнанні з 20-мі гг. за кошт прыцягвання да краязнаўчай справы працоўных мас, у першую чаргу рабочых, калгаснікаў і вучнёўскай моладзі.

У 1931 г. пры БАН была ўтворана новая структура – Сектар масавай работы, які ставіў сваёй мэтай кіраўніцтва краязнаўчым рухам ў рэспубліцы, выяўленне нізавых кадраў для прыцягвання іх да навукова-даследчай працы, уцягванне ў навукова-даследчую і краязнаўчую працу шырокага кола працаўнікоў і інтэлігенцыі. У склад сектара ўваходзіў ЦБК [6].

З мэтаю накіравання краязнаўчых даследаванняў на новы шлях прэзідыумам БАН у 1931 г. была ўстаноўлена новая сістэма краязнаўчых арганізацый. Асноваю новай арганізацыі былі зроблены раённыя бюро краязнаўства (РБК) і краязнаўчыя ячэйкі, якія ўтвараліся на прадпрыемствах, саўгасах, калгасах, школах і ВНУ. Праца краязнаўчых ячэек аб’ядноўвалася і каардынавалася шляхам правядзення мясцовых (раённых) канферэнцый. На канферэнцыях абіраўся склад раённага бюро для планавання краязнаўчай працы па раёне. Новаму ЦБК было даручана распрацаваць планы працы, метадычны матэрыял і зрабіць адпаведныя захады па наладжванні больш цесных сувязяў з СНК, структурамі планаваня, гаспадарчымі і эканамічнымі структурамі.

Карэнным адрозненнем раённых бюро і ячэек ад ранейшых акруговых, раённых таварystваў і гурткоў краязнаўства было тое, што новыя адзінкі займаліся не столькі краязнаўчымі даследаваннямі, колькі іх папулярызацыяй і ўцягваннем у краязнаўчую справу шырокіх колаў грамадства (рабочых, калгаснікаў, вучняў). Быў выключаны прынцып дабрачыннасці, РБК падпарадкоўваліся загадам зверху. Краязнаўчыя ячэйкі арганізоўваліся на фабрыках, заводах, МТС, саўгасах, калгасах і займаліся вывучэннем свайго аб’екта і прылеглай мясцовасці [6, арк. 1–4].

У 1931 г. краязнаўцы па закліках ЦБК удзельнічалі ў правядзенні кампаній па зборы сродкаў на павышэнне абароназдольнасці краіны, падрыхтоўцы кадраў у сельскай гаспадарцы і інш. Прычым на старшынь раённых бюро ўскладалася асабістая адказнасць за паспяховасць усіх кампаній. Члены прэзідыума ЦБК асабіста прымалі ўдзел у некаторых з кампаній (напрыклад, двухмесячны агляд дасягненняў у сацыялістычнай гаспадарцы). Аднак у 1931 г. дзейнасць Масавага сектара і ЦБК не дала значных вынікаў. У большасці раёнаў краязнаўчая праца так і не была распачата.

На працягу 1932 г. Культпроп ЦК КП(б)Б, Наркамат асветы БССР, Культсектар ЦСПСБ і Сектар культуры і навукі Дзяржплана БССР выдаюць спецыяльныя распараджэнні сваім ніжэйшым органам і ўстановам адносна іх дапамогі краязнаўчай працы на месцах [7, с. 75–77].

1 чэрвеня 1932 г. выходзіць спецыяльная пастанова Савета Народных камісараў БССР «Пра мерапрыемствы па разгортванні краязнаўчага руху». У пастанове было адзначана, што Цэнтральнае бюро краязнаўства і мясцовыя краязнаўчыя арганізацыі не справіліся з пастаўленымі перад імі задачамі і не здолелі ўцягнуць у краязнаўчую працу шырокія працоўныя масы. У сувязі з гэтым СНК БССР пастанаўляў прапанаваць ЦБК і мясцовым краязнаўчым арганізацыям перабудаваць усю работу краязнаўчых арганізацый у парадку поўнага падпарадкавання ўсёй краязнаўчай працы канкрэтным планам рацыянальнага будаўніцтва кожнага раёна, прадпрыемства, саўгаса, калгаса і ў інтарэсах павышэння абароназдольнасці краіны [8].

У 1932–1933 гг. працягвалася праца па ўвядзенні краязнаўства ў сістэму адукацыі. У 1933 г. Дзяржаўны вучоны савет Наркамата асветы БССР у новым вучэбным плане педтэхнікумаў зацвердзіў спецыяльны курс методыкі краязнаўства. Курс быў разлічаны на 25 гадзін. ЦБК дзейнічаў вельмі актыўна ў сферы распрацоўкі метадычных інструкцый, за 1931–1932 гг. такіх было выдадзена асобнымі накладамі больш за 20 адзінак (напрыклад, «Вывучай калгас» В. Серафімава або «Як арганізаваць вывучэнне фабрык і заводаў» В. Самцэвіча) [9].

Аднак вынікі кампаніі аказаліся даволі сціплымі. У 1933 г. выходзіць толькі адзін нумар часопіса «Савецкая краіна», далей яго выданне прыпыняецца. Нават пасля шматлікіх пастаноў мясцовыя органы надавалі краязнаўцам мала ўвагі. Ад гэтага засталіся нявырашанымі шмат праблемаў, якія зніжалі эфектыўнасць савецкага краязнаўства і ўзровень ініцыятывы актывістаў краязнаўчых бюро і ячэек. На пачатку 1932 г. краязнаўчыя арганізацыі існавалі ў 25 раёнах БССР і складаліся пераважна з раённага краязнаўчага актыву, аб'яднанага вакол раённага бюро краязнаўства, пры наяўнасці нязначнай колькасці краязнаўчых ячэек у пераважнай колькасці раёнаў. На пачатку 1933 г. краязнаўчыя ячэйкі былі ў 43 раёнах. Усяго налічвалася 43 раённыя бюро краязнаўства, 103 краязнаўчыя ячэйкі, 15 на прадпрыемствах, 32 пры калгасах і саўгасах, 46 ячэек пры школах і пры ВНУ і тэхнікумах каля 10. Да пачатку 1933 г. лічба, якой валодала ЦБК, складала каля 2552 чал. у 19 раёнах. Да таго ж шмат краязнаўчых арганізацый існавала толькі на паперы [10, с. 79–81]. Спробы прыцягнуць у краязнаўчы руху працоўных Беларусі (сялян і рабочых) поспеху не мелі.

У 1933–1935 гг. дзейнасць ЦБК амаль не асвятлялася ў друку, адсутнічаюць і архіўныя крыніцы гэтага часу. На паседжанні прэзідыума БАН 21 лютага 1935 г. зацвярджаецца палажэнне аб новай установе – Савеце па вывучэнні прадукцыйных сілаў БССР (фігуруе ў дакументах як «СОПС»). Галоўнай задачай СОПС было, абапіраючыся на інстытуты і паасобныя ўстановы Акадэміі навук, планаваць, каардынаваць і арганізоўваць экспедыцыйныя работы Акадэміі ў галіне прыродных рэсурсаў. ЦБК увайшло ў склад СОПС. У 1935 г. ЦБК у складзе СОПС займалася вывучэннем умоў працы энерга-хімічнага камбіната, пабудова якога была запланавана ў мястэчку Прапойск. Па-ранейшаму краязнаўчую працу ажыццяўлялі сектары яўрэйскай, польскай, літоўскай і латышскай пралетарскай культуры БАН [11].

Наступны ўздым цікавасці да пытання краязнаўчага руху з боку савецкіх уладаў адбываецца вясной 1936 г. Ён быў выкліканы з ініцыятывы А. М. Саакяна, члена Бюро ЦК КП(б)Б. А. М. Саакян звярнуў увагу першага сакратара бюро ЦК К(б)Б М. Ф. Гікала ў спецыяльным лісце. У ім падкрэсліваў вялікую карысць выкарыстання краязнаўчай працы, у першую чаргу ў сферы пошукаў карысных выкапняў сыравіны. Для гэтага прапанаваў выкарыстаць вучняў школ, моладзь, камсамольскія арганізацыі [12, с. 79–81]. У выніку была створана камісія пры ЦК КП(б)Б у складзе А. М. Саакяна, прэзідэнта БАН І. З. Сурта, А. В. Аўгустойціса, З. З. Кавальчукаі інш. [13, арк. 317–318].

Па выніках працы гэтай камісіі 21 чэрвеня 1936 г. была прынята пастанова ЦК КП(б)Б «Аб краязнаўчай рабоце і становішчы музейнай справы ў БССР», у якой ранейшая краязнаўчая праца была прызнаная нездавальняючай. Наркамату асветы БССР, ЦК ЛКСМБ і прафсаюзам прапаноўвалася разгарнуць краязнаўчую работу ў сферы школьных турысцкіх паходаў, арганізацыі экскурсій школьнікаў і піянераў з мэтай збірання разнастайных экспанатаў, калекцый, вывучэння мясцовасці на прадмет наяўнасці сыравіны. Пастановай мясцовыя саветы абавязваліся палепшыць становішча краязнаўчых музеяў, забяспечыць іх фінансаваннем і належнымі памяшканнямі для экспанатаў. Для ўзгаднення краязнаўчай і музейнай працы, ажыццяўляемай арганізацыямі і ўстановамі БССР, агаворвання агульных пытанняў краязнаўства пастановай было запланавана стварыць пры Народным камітэце асветы Савет па краязнаўству [14, арк. 317–318].

Гэта пастанова вырашыла лёс ЦБК. На паседжанні прэзідыума БАН 22 траўня 1936 г. было пастаноўлена з прычыны перадачы ўсёй краязнаўчай працы і краязнаўчых музеяў у распараджэнне Народнаму камісарыяту асветы ліквідаваць бюро краязнаўства пры СОПС БАН [14, арк. 58].

Апошні перыяд, які тычыцца працы ЦБК і Савета па краязнаўству пры Народным камісарыяце асветы у другой палове 1936 – пачатку 1938 г., вылучаецца адсутнасцю крыніц, матэрыялы архіву Наркамата асветы БССР за гэты перыяд адсутнічаюць.

У 1937 г. выходзіць пастанова СНК СССР «Аб рэарганізацыі краязнаўчай працы ў цэнтры і на месцах», дзе было прызнана немэтазгодным далейшае існаванне цэнтральных і мясцовых бюро краязнаўства. Народнаму камісарыяту асветы СССР было прадпісана прыняць меры па іх ліквідацыі. Такімі мерамі можна лічыць ліст-дырэктыву Наркамата асветы СССР «Аб пастаноўцы і арганізацыі краязнаўчай працы» 25 красавіка 1938 г. У ёй было падкрэслена, што патрэбы ў існаванні і стварэнні спецыяльных краязнаўчых арганізацый няма. Уся навукова-метадычная і краязнаўчая праца перакладалася на мясцовыя краязнаўчыя музеі. Апошнія ні па колькасці, ні па сваіх магчымасцях не змаглі замяніць краязнаўчыя арганізацыі [15, с. 200].

**Высновы.** Такім чынам, нягледзячы на рэпрэсіўныя меры да некаторых прадстаўнікоў краязнаўчага руху, ліквідаванне сеткі краязнаўчых арганізацый, сфарміраванай ў сярэдзіне 20-х гг., у пачатку 30-х гг. краязнаўчы руху працягваў існаваць і дзейнічаць ужо ў новым выглядзе. У 1931–1932 гг. была сфарміравана новая сістэма краязнаўчых арганізацый (раённыя бюро і ячэйкі краязнаўства), якая з'явілася значна больш цэнтралізаванай, бюракратызаванай, фармалізаванай, пазбаўленай прынцыпу добраахвотнасці.

У сферы навукова-даследчай дзейнасці краязнаўчых арганізацый былі вызначаны мэты выключна эканамічнага характару. Перад краязнаўцамі ставіліся задачы вывучэння вытворчых сілаў (прыродных багаццяў, флоры, фауны, карысных выкапняў) і асвятлення поспехаў сацыялістычнага будаўніцтва (індустрыялізацыі і калектывізацыі). Новая методыка краязнаўчых даследаванняў у гэтых сферах была дасканала распрацавана кіраўніцтвам ЦБК у супрацоўніцтве з навуковымі інстытутамі і аддзеламі БАН і выдадзена ў вялікай колькасці асобнікаў у 1931–1932 гг.

Разам з тым новая мадэль пабудовы краязнаўчага руху не дасягнула вялікіх поспехаў, а пасля 1933 г. яе дзейнасць не была асветлена ў друку, адсутнічаюць крыніцы, якія дазваляюць гаварыць аб наяўнасці практычных вынікаў працы ЦБК і мясцовых краязнаўчых таварыстваў.

Павышэнне цікавасці з боку ўладаў да краязнаўчага руху і магчымасці вызначэння напрамкаў яго дзейнасці адбываецца ў 1936 г. Тады былі выдадзены пастановы, якія накіроўвалі краязнаўчую дзейнасць ў сферу адукацыі, турызму і музейнай справы. У 1938 г. адбываецца фактычная і канчатковая ліквідацыя краязнаўчых таварыстваў у БССР.

**Літаратура**

1. Амелькович, Л. Г. Деятельность центрального бюро краеведения Белоруссии (1923–1933 гг.) / Л. Г. Амелькович // Вопросы библиотековедения и библиографоведения. – Минск, 1975 – С. 59–76.

2. Алексеев, А. В. Археология и краеведение в Белоруссии. XVI – 30-е г. XX ст. / А. В. Алексеев. – Минск: Беларуская наука, 1996. – 206 с.

3. Историческое краеведение Белоруссии: учеб. пособие / Ваганова А. Н. [и др.]. Под. ред. Э. М. Загорульского. – Минск: БГУ, 1980. – 240 с.

4. Цэнтральны навуковы архіў Акадэміі навук Беларусі (ЦНА АНБ). Ф. 1. Воп. 1. Спр. 6. Пратаколы пасяджэнняў прэзідыума Беларуская Акадэміі Навук.

5. Хроніка. Вынікі правядзення «краязнаўчай пяцідзёнкі» // Савецкая краіна. – 1931 – № 9. – С. 75–77.

6. ЦНА АНБ. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 15. Арк. 1–4. Пратаколы пасяджэнняў прэзідыума Беларуская Акадэміі Навук.

7. Дзяржаўны Архіў Мінскай Вобласці (ДАМВ), Ф. 328. Воп. 1. Спр. 12. Отдел народного образования Логойского совета рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов. Документы по развертыванию краеведческого движения в районе за 1932 г.

8. Нацыянальны архіў рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 7. Воп. 1. Спр. 815. Ч. 2. Пратаколы пасяджэнняў Бюро ЦК КП(б)Б арк.

9. Самцэвіч, В. Як арганізаваць манаграфічнае вывучэнне раёну / В. Самцэвіч. – Мінск, Масавы сектар і ЦБ краязнаўства, 1931. – 15 с.

10. Работа ЦБК за 1932г. // Савецкая краіна. – 1933. – №1. – С. 79–81.

11. ЦНА АНБ. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 31. Пратаколы пасяджэнняў прэзідыума Беларуская Акадэміі Навук.

12. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 3. Спр. 9145. Пратаколы пасяджэнняў Бюро ЦК КП(б)Б.

13. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 3. Спр. 9159. Пратаколы пасяджэнняў Бюро ЦК КП(б)Б.

14. ЦНА АНБ. Ф. 1. Воп 1. Спр. 50. Арк. 104. Пратаколы пасяджэнняў прэзідыума Беларускай Акадэміі Навук.

15. Разгон, А. М. Пути советского краеведения / М. А. Разгон // История СССР. – № 4. – С. 190–201.